**Пачэсны** абавязак салдата / падрыхт. А. Барыла // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2009. — 18 лют. — С. 2.

## ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК САЛДАТА

*Віктар Качан зараз працуе грузчыкам у райспажыўтаварыстве. У яго ёсць сям'я. З жонкай Алай (супрацоўніцай раённага вузла паштовай сувязі) выхоўваюць сына Андрэя (студэнта Мінскага будаўнічага каледжа) і дачку Лену, якая вучыцца ў Шаркаўшчынскай СШ № 2. Нямногія ведаюць, што Віктар ваяваў у Афганістане. Як памяць пра тую вайну застаўся медаль «За адвагу», а таксама наручны імянны гадзіннік. Сёння Віктар Качан госць рэдакцыі і дзеліцца ўспамінамі:*

– Нарадзіўся ў 1969 годзе ў вёсцы Жукі Горныя. Пасля заканчэння Германавіцкай СШ па накіраванні ваенкамата вучыўся ў аўташколе – хацелася атрымаць «правы».

У 1987 годзе прыйшла павестка аб прызыве ў армію. 11 лістапада, ужо ля райваенкамата даведаўся, што наша каманда – «220 А» – накіроўваецца ў Афганістан. Усімі сіламі імкнуўся не паказаць, што хвалююся, хаця разумеў, куды трапляю – баявыя дзеянні ў гэтай паўднёвай краіне вяліся восем гадоў.

Размеркавалі ў пагранічныя войскі. Адразу накіравалі ў «вучэбку» ў Туркменскую ССР. Мяне прызначылі вадзіцелем. Шмат увагі ўдзялялі ўдасканаленню вадзіцельскіх навыкаў – шматгадзінныя трэніроўкі на аўтадроме. Афіцэры клапаціліся пра нашу фізічную падрыхтоўку: бег, марш-кідкі сталі нормай для маладых пагранічнікаў.

4 сакавіка 1988 года мы перасяклі мяжу з Афганістанам. У падраздзяленні было 5 мотаманёўравых груп, у склад адной трапіў і я. Перад намі стаяла задача: ахоўваць мяжу і тэрыторыю вакол яе. Месца дыслакацыі – каля горада Кайсар.

Пачаліся доўгія адзінаццаць месяцаў службы ў Афгане, праўда, тады не ведаў, колькі будзе доўжыцца «неаб'яўленая» вайна.

Мне выдзелілі імянны аўтамабіль Генадзія Скурчаева (герой-гамяльчанін, які аддаў жыццё пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку). На гэтай машыне – ЗІЛ-131 – вазіў боепрыпасы, ваду, прадукты харчавання. Даводзілася выконваць іншыя даручэнні.

Здаралася, на калону нападалі маджахеды. Вадзіцелі і група суправаджэння адбівалі атакі.

Запомнілася, як «духі» акружылі наш лагер і пачалі абстрэл. Кальцо трымалася тры дні. Мы абараняліся – усе, хто маглі, адстрэльваліся. Зняла блакаду толькі авіяцыя – на дапамогу прыйшлі 28 верталётаў.

Салдаты і афіцэры, дапамагаючы афганскаму народу, верылі, што наша прысутнасць нясе свабоду жыхарам гэтай краіны. Разам са мной служылі хлопцы з Шаркаўшчынскага раёна. З Анатоліем Сямёнавым з Іёд у адзін дзень прызываліся, у адзін дзень і на «дэмбель» пайшлі. Часта бачыліся з Ігарам Няверчыкам з Ручая, Іванам Кляноўскім з Вялікага Сяла і Юрыем Рубніковічам з Германавіч.

Маладыя байцы годна выконвалі свой салдацкі абавязак, бо для нас існавала паняцце «трэба». Моцная спякота, вялікая фізічная нагрузка, пастаянная небяспека – усё гэта давялося перажыць. Але ніхто не скардзіўся, не панікаваў.

Бацькі адразу нават не ведалі, што я трапіў у Афган. Лісты дасылалі на адрас часці, што дыслацыравалася ў Туркменіі. Я не пісаў, дзе служу, бо не хацеў, каб маці з бацькам хваляваліся і перажывалі. Толькі пад канец службы адзін знаёмы, будучы ў водпуску, расказаў маім родным, дзе на самой справе служыць сын.

Добра памятаю 15 лютага 1989 года – дзень вываду савецкіх войск з Афганістана. На ЗІЛу-131 рухаўся ў складзе калоны, якая адной з апошніх пакідала гэту паўднёвую краіну, дзе палягло столькі салдат (тады і мы не ведалі канкрэтных лічбаў пра колькасць загінуўшых і параненых). Ехаў у Савецкі Саюз і не верыў, што вайна скончылася, што жывым вяртаюся дадому. Мы радаваліся бязмерна.

Прыбыўшы на месца дыслакацыі падраздзялення, пачалі прывыкаць да мірнай салдацкай службы. Пад’ём, зарадка, заняткі ў класах. Не трэба ехаць у калоне па гарах, стаяць на варце, чакаючы абстрэлу. Кладучыся спаць, не баішся заўтрашняга ранку. Мірнае неба над галавой – вялікае шчасце.

Пасля дэмабілізацыі яшчэ доўга ўспамінаў армейскія будні, найчасцей, афганскі перыяд службы. Аналізаваў, думаў. Галоўнае, што годна рабіў сваю справу, не хаваючыся за спіны іншых. А гэта і ёсць пачэсны абавязак салдата!

**Матэрыял падрыхтаваў А. Барыла**